

# Мар'ян Дукса

**(нар. у 1943)**

# Біяграфія

**Марʼян Дукса – вядомы беларускі пісьменнік.**

**Нарадзіўся 5 красавіка 1943 года ў вёсцы Каракулічы Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.**

**Рана страціў бацьку. У 1958 – 1960 гг. займаўся ў Свірскім вучылішчы механізацыі сельскай гаспадаркі, закончыўшы яго, працаваў у калгасе ўлікоўцам трактарнай брыгады, адначасова вучыўся завочна ў сярэдняй школе.**

**У 1969 годзе скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта і пачаў працаваць настаўнікам Сольскай сярэдняй школы**

**На старонках рэспубліканскай перыёдыкі выступае з вершамі з 1960 года.**

**Выдаў вершаваныя зборнікі «Спатканне» , «Крокі» , «Станцыя» , «Прыгаршчы суніц» , «Забытыя словы» , «Зона супраціўлення» , «Твая пара сяўбы» , «Заснежаныя ягады» . Аўтар кніг для дзяцей «Зялёны акварыум» і «Світаюць сосны» .**

**Лаўрэат Літаратурнай прэміі Саюза пісьменнікаў Беларусі імя А.Куляшова за кнігу паэзіі “Заснежаныя ягады” (1989).**

**Першая кніга паэта - “Спатканне” - выйшла з друку ў 1967 г.**

**Пісаў пра свае дзяцінства, пра зямлю і чалавека на ёй, пра каханне ды адзіноту, якая часта мяжуе з гэтым светлым пачуццем. Можна было заўважыць, што паэт вельмі чуйны да роднай прыроды, але сваё захапленне ёю выказвае неяк стрымана, быццам хоча агледзецца навокал, паразважаць.**

**Да прыроды ў мастака слова своеасаблівае, пяшчотнае стаўленне. Ён усей душой адчувае яе безабароннасць і лічыць збяднелым у пачуццях чалавека, які не адчувае сваіх каранёў і саей повязі з прыродай.**

**Муза паэта так і не параднілася з горадам. Усё свае жыцце, акрамя хіба студэнцкіх гадоў, Мар’ян Дукса звязаў з вёскаю.**



## Ранішняя малітва

О, дзень вясёлы, шматгалосы,
Ідзеш ты шпаркаю хадой.
Пашлі мне ясныя нябёсы
І рэчку з цёплаю вадой.
Пашлі мне, новы дзень, удачу-
Шчаслівым быць зусім не грэх,
І не даводзь мяне да плачу,
І прынясі сягоння смех.
Хачу, каб сон мой добры збыўся,
Каб я блінцоў наеўся ўсмак,
Ні з кім не біўся, не сварыўся,
Не пудзіў кошак і сабак.
Хай будзе ў нас навокал згода,
Усцешыцца мая радня,
Хай будзе між людзьмі лагода
І запануе дабрыня.
І цэлы дзень са мной таксама
Хай дзень шчаслівы пражыве.